Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
і адукацыйных інавацыях
________________ В.Л. Чупрыс
________________ 2018 г.

Рэгістрацыйны № УД-6429/вуч.

# Тэксталінгвістыка

## Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для магістраў спецыяльнасці

**1–21 81 04 «Тэксталогія»**

2018 г.

Вучэбная праграма УВА складзена на аснове вучэбных планаў па спецыяльнасці «Тэксталогія» Д 21-2-021/тып., Д 21-2-034/тып, зацверджаных 25.05.2017 г., і Д 21-255/уч., зацверджанага 26.05.2017

СКЛАДАЛЬНІК:
Г. К. Чахоўскі, дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы
філалагічнага факультэта БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭЦЭНЗЕНТ:
А. А. Лукашанец, першы намеснік па навуковай рабоце «Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, акадэмік НАН Беларусі

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай сучаснай беларускай мовы
(пратакол № 4 ад 19.12.2018 г.)

Навукова-метадычным Саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 2 ад 28.12. 2018 г.)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Тэксталінгвістыка» ўваходзіць у цыкл дысцыплін спецыяльнай падрыхтоўкі дзяржаўнага кампанента і звязана з такімі лінгвістычнымі дысцыплінамі, як: «Лінгвістыка тэксту», «Сучасная беларуская мова», «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы», «Агульнае мовазнаўства», «Гістарычная граматыка беларускай мовы».

Веданне агульных пытанняў тэорыі тэксту (структура тэксту, успрыманне тэксту, тыпалогія тэкстаў і інш.), авалоданне навыкамі яго аналізу мае асаблівае значэнне і для будучых літаратурна-рэдакцыйных супрацоўнікаў.

Асноўная **мэта** вывучэння дысцыпліны “Тэксталінгвістыка” – сфарміраваць уяўленне аб тэксце як аб’екце лінгвістычнага аналізу, аб заканамернасцях пабудовы тэксту і спецыфіцы яго функцыянавання.

**Задачы** курса:

- забяспечыць неабходны аб’ём тэарэтычных звестак аб тэксце;
- сфарміраваць уменне аналізаваць тэксты рознай жанрава-стылявой прыналежнасці;
- развіваць крэатыўныя магчымасці магістрантаў у плане стварэння тэкстаў навуковага, публіцыстычнага, рэкламнага характару;
- фарміраваць уменні рэдагаваць тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці, удасканальваць тэксты з мэтай узмацнення іх выразнасці.

Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны “Тэксталінгвістыка” ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам:

магістр павінен **ведаць**:

- месца, ролю і значэнне тэксталінгвістыкі сярод іншых філалагічных дысцыплін;
- гісторыю ўзнікнення тэксталінгвістыкі ў Беларусі і замежжы;
- асноўныя падыходы да даследавання граматычнай прыроды тэксту;
- асноўныя тэкставыя катэгорыі;
- найбольш істотныя характарыстыкі тэкстаў розных тыпаў;
- прыёмы і метады вызначэння прэцэдэнтнасці і экспрэсіўнасці тэксту;
- нормы нацыянальнага тэкстаўтварэння.

Магістр павінен **умець**:

- праводзіць лінгвістычны і філалагічны аналіз мастацкага, публіцыстычнага, навуковага, рэкламнага тэксту;
- вызначаць моўныя асаблівасці і стыль тэкстаў;
- выяўляць ідыястылістычныя асаблівасці (мастацкіх) тэкстаў;
- вызначаць сродкі і прыёмы стварэння экспрэсіўнасці тэксту;
- вызначаць нацыянальна-маркіраваны кампанент у тэкстах розных тыпаў і жанраў.

Магістр павінен **валодаць**:

- нормамі вуснага і пісьмовага маўлення сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

- уменнямі аналізаваць фактычны матэрыял;
- уменнямі вызначаць прагматычныя задачы тэкставыхх адзінак;
- уменнямі генераваць звязныя тэксты адпаведнай прагматычнай накіраванасці ў адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

**Патрабаванні да акадэмічнай кампетэнцыі магістра.**

Магістр павінен мець:

АК-1. Здольнасць да самастойнай навукова-даследчай дзейнасці (аналіз, супастаўленне, сістэматызацыя, абстрагаванне, мадэляванне, праверка дакладнасці дадзеных, прыняцце рашэння і інш.), гатоўнасць генераваць і выкарыстоўваць новыя ідэі.

АК-2. Метадалагічныя веды і даследчыя уменні, якія забяспечваюць рашэнне задач навукова-даследчай, навукова-педагагічнай, упраўленчай і інавацыйнай дзейнасці.

АК-3. Здольнасць да пастаяннай самаадукацыі.

**Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый магістра**

Магістр павінен быць здольны:

СЛК-1. Удасканальваць і развіваць свой інтэлектуальны і агульнакультурны ўзровень, дабівацца маральнага і фізічнага ўдасканалення сваёй асобы.

СЛК-2. Карыстацца адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь і іншай замежнай мовай як сродкам дзелавога камунікавання.

СЛК-3. Фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесіянальную пазіцыю.

СЛК-4. Аналізаваць і прымаць рашэнні па сацыяльных, этычных, навуковых і тэхнічных праблемах, якія ўзнікаюць у прафесійнай дзейнасці.

СЛК-5. Выкарыстоўваць у практычнай дзейнасці асновы працоўнага заканадаўства і прававых нормаў.

СЛК-6. Лагічна, аргументавана і ясна будаваць вуснае і пісьмовае маўленне, выкарыстоўваць навыкі публічнага маўлення, вядзення дыскусіі і палемікі.

СЛК-7. Працаваць у камандзе, кіраваць і падпарадкоўвацца.

СЛК-8. Паважліва і беражліва ставіцца да гістарычнай спадчыны і культурных традыцый, талерантна ўспрымаць сацыяльныя і культурныя адрозненні.

СЛК-9. Праяўляць ініцыятыву і крэатыўнасць, у тым ліку і ў нестандартных сітуацыях.

СЛК-10. Аказваць асабістым прыкладам пазітыўнае ўздзеянне на акружэнне і ўдзельнікаў прафесійнай дзейнасці з пункту погляду захавання правілаў здаровага ладу жыцця, актыўнай творчай жыццёвай пазіцыі.

СЛК-11. Адаптавацца да новых сітуацый сацыяльна-прафесійнай дзейнасці, рэалізоўваць назапашаны досвед, свае магчымасці.

**Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый магістра**

Магістр павінен быць здольны:

**Навукова-педагагічная і вучэбна-метадычная дзейнасць**

ПК-1. Праводзіць вучэбныя заняткі ва ўстановах сярэдне спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

ПК-2. Распрацоўваць і выкарыстоўваць сучаснае вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

ПК-3. Асвойваць і ўкараняць у вучэбны працэс інавацыйныя адукацыйныя тэхналогіі.

ПК-4. Кіраваць навукова-даследчай працай навучэнцаў.

ПК-5. Планаваць і арганізоўваць выхаваўчую працу з навучэнцамі.

ПК-6. Ажыццяўляць маніторынг адукацыйнага працэсу, дыягностыку вучэбных і выхаваўчых вынікаў.

**Навукова-даследчая дзейнасць**

ПК-7. Кваліфікавана праводзіць навуковыя даследаванні ў галіне філалогіі.

ПК-8. Распрацоўваць практычныя рэкамендацыі па ўкараненні навуковых даследаванняў, планаванні і правядзенні эксперыментальных даследаванняў, навукова-тэхнічную дакументацыю.

ПК-9. Ужываць сучасную метадалогію літаратуразнаўчых даследаванняў.

ПК-10. Распрацоўваць прапановы па павышэнні эфектыўнасці плануемых даследаванняў.

**Арганізацыйна-ўпраўленчая дзейнасць**

ПК-11. Прымаць аптымальныя ўпраўленчыя рашэнні.

ПК-12. Асвойваць і рэалізоўваць упраўленчыя інавацыі ў прафесійнай дзейнасці.

**Інавацыйная дзейнасць**

ПК-13. Распрацоўваць планы і праграмы арганізацыі інавацыйнай дзейнасці, навукова абгрунтоўваць інавацыйныя праекты ў прафесійнай дзейнасці.

ПК-14. Праводзіць даследаванні, заснаваныя на інавацыйных тэхналогіях і методыках (навукова-даследчая дзейнасць).

ПК-15. Выкарыстоўваць дасягненні навукі і перадавыя тэхналогіі ў адукацыйнай і навукова-даследчай сферах.

Агульная колькасць гадзін на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны для магістрантаў спецыяльнасці «Тэксталогія» (1–21 81 04) складае **180 гадзін**.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.
Колькасць аўдыторных складае **48 гадзін**.
Размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў:
лекцыйных – 28 гадзін,
практычных – 20 гадзін.
Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – экзамен.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ
## «ТЭКСТАЛІНГВІСТЫКА»

**1. Тэксталінгвістыка як вучэбная дысцыпліна.** Прадмет і задачы тэксталінгвістыкі. Перадумовы для фарміравання тэксталінгвістыкі: антычныя рыторыкі, узоры цэласнага філалагічнага аналізу літаратурных твораў, тэорыя мовы мастацкай літаратуры, функцыянальная стылістыка, тэорыя актуальнага члянення выказвання, тэорыя дэрывацыі, семантычны сінтаксіс і інш.

Міждысцыплінарны характар тэксталінгвістыкі.

**2. Тэкст у сістэме моўных адзінак і моўных узроўняў.** Тэкст як кампанент маўленчай і мысленчай дзейнасці. Кампаненты тэкставай дзейнасці: аўтар (адрасант) тэксту, адрасат, тэкст, маўленчая рэчаіснасць, моўная сістэма. Агульнасеміятычнае і лінгвістычнае разуменне тэксту. Праблема дэфініцыі тэксту. Суадносіны паняццяў тэкст і дыскурс. Пытанне аб межах і аб’ёме тэксту. Статус тэксту як моўнай і маўленчай адзінкі.

Шматаспектнасць вывучэння тэксту: граматыка тэксту, семантыка тэксту, стылістыка тэксту, прагматыка тэксту. Інтэрпрэтацыя тэксту. Паняцце герменеўтыкі.

Асноўныя падыходы да вывучэння тэксту: лінгвацэнтрычны, тэкстацэнтрычны, антрапацэнтрычны, кагнітыўны, функцыянальны, прагматычны, рытарычны і інш.

Напрамкі даследавання тэксту ў беларускім мовазнаўстве: стылістычны; семіятычны; рытарычны (І.Я. Лепешаў; Г.М. Малажай, В.А. Маслава, А.І. Равуцкі, М.Я. Цікоцкі, А.Л. Юрэвіч, Ф.І. Янкоўскі; А.Я. Супрун; А.Я. Міхневіч і інш.).

**3. Інтэграцыйныя параметры тэксту.** Тэматычнае адзінства, адзінства знешняй і ўнутранай формы тэксту. Разгорнутасць тэксту. Тэма як згорнуты змест тэксту. Разгортванне тэмы і забеспячэнне паўнаты яе выяўлення праз падтэмы і мікратэмы. Паслядоўнасць як схема, якая адлюстроўвае парадак элементаў зместу. Кампазіцыя тэксту.

Звязнасць тэксту. Спосабы сэнсавай сувязі сказаў у тэксце: 1) сувязь праз вядомае (з выкарыстаннем скразной тэмы); 2) сувязь праз новае; 3) сувязь праз вядомае ў першым сказе (з выкарыстаннем гіпертэмы); 4) сувязь змешанага тыпу. Ланцужная і паралельная сувязь. Экспліцытная і імпліцытная сувязь. Левабаковая і правабаковая сувязь. Звязнасцьрадыяльнага тыпу і лінейнага тыпу. Структурныя сродкі сувязі: лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя. Паўторная намінацыя і яе функцыі ў тэксце. Намінацыйныя ланцужкі.

Цэласнасць тэксту. Камунікатыўнае, сэнсавае і тэматычнае адзінства як перадумовы стварэння цэласнасці тэксту. Роля ключавых слоў у забеспячэнні цэласнасці тэксту. Набор ключавых слоў як сэнсавы лейтматыў тэксту. Аўтар як ключавая фігура тэксту. Роля аўтарскай пазіцыі, аўтарскай ацэнкі ў стварэнні цэласнасці тэксту.

Закончанасць як інтэграцыйны параметр тэксту, які ўзнікае на аснове разгорнутасці, паслядоўнасці, звязнасці.

**4. Семантычная арганізацыя тэксту.** Канцэптуальная прастора тэксту. Дэнататыўная прастора тэксту. Эматыўная прастора тэксту. Камунікатыўна-сінтаксічная арганізацыя тэксту. Паняцце гіпертэмы і гіперрэмы. Монаструктурныя і поліструктурныя тэксты. Прыметы расчлянення тэксту: сегментацыя, парцэляцыя, антыцыпацыя.

Знакавая прырода тэкставых катэгорый. Асноўныя катэгорыі тэксту: інфарматыўнасць, чляністасць (падзельнасць), кагезія, кантынуум, вертыкальны кантэкст, дыялагічнасць, рэтраспекцыя і праспекцыя, мадальнасць, падтэкст, сацыялагічнасць, інтэграцыя і завершанасць. Тэкставы кантынуум і тэкставая мадальнасць. Узаемаабумоўленасць тэкставых катэгорый.

5. **Віды інфармацыі ў тэксце**. Зместава-фактуальная інфармацыя, зместава-канцэптуальная інфармацыя, зместава-падтэкставая інфармацыя. Падтэкст і “прырашчэнне” сэнсу ў тэксце.

Аб’ёмна-прагматычнае і кантэкстава-варыятыўнае чляненне тэксту. Асаблівасці члянення мастацкіх (празаічных, драматычных, паэтычных), навуковых, афіцыйна-справавых, публіцыстычных тэкстаў.

**6. Катэгорыі тэксту.** Кагезія як від унутрытэкставых сувязей, якія забяспечваюць лагічную ўзаемазалежнасць асобных паведамленняў, фактаў, дзеянняў. Сродкі і формы кагезіі: традыцыйна-граматычныя, лагічныя, асацыятыўныя, вобразныя, кампазіцыйна-структурныя, стылістычныя, рытмаўтваральныя. Кантактная і дыстантная кагезія.

Кантынуум як тэкставая катэгорыя, якая адлюстроўвае паслядоўнасць фактаў, падзей, з’яў, разгорнутых у часе і прасторы. Стандартныя і нестандартныя адзінкі вымярэння часу.

Аўтасемантыя як катэгорыя, якая аб’ядноўвае формы залежнасці і адноснай незалежнасці адрэзкаў тэксту ў адносінах да зместу ўсяго тэксту або яго элементаў. Аўтарскія адступленні, сентэнцыі, афарызмы, цытаты як формы рэалізацыі аўтасемантыі.

Рэтраспекцыя і праспекцыя як формы дыскантынууму. Імпліцытная і эксплiцытная формы рэалізацыі рэтраспекцыі і праспекцыі. Суб'ектыўна-чытацкая і аб’ектыўна-аўтарская рэтраспекцыя. Асаблівасці выражэння рэтраспекцыі і праспекцыі ў мастацкіх, навуковых, публіцыстычных тэкстах.

Мадальнасць тэксту. Аб’ектыўна-мадальныя і суб'ектыўна-мадальныя значэнні. Фразавая і тэкставая мадальнасць. Спецыфіка рэалізацыі мадальнасці ў мастацкіх, публіцыстычных, навуковых тэкстах.

Інтэграцыя як працэс і як вынік звязанасці асобных частак тэксту ў адзінае цэлае. Асаблівасці рэалізацыі інтэграцыі ў мастацкіх і навуковых тэкстах.

Вычарпальнае выражэнне задумы як паказчык завершанасці тэксту. Завершанасць і наўмысная незавершанасць тэксту. Сувязь катэгорыі завершанасці з назвай (загалоўкам) тэксту. Размежаванне паняццяў завершанасці і канцоўкі тэксту.

Факультатыўныя (другасныя) катэгорыі тэксту: абсалютная антрапацэнтрычнаць, сацыялагічнасць, дыялагічнасць, статычнасць і дынамічнасць, напружанасць, эстэтычнасць, вобразнасць і інш.

Катэгорыя экспрэсіўнасці тэксту. Экспрэсіўныя рэсурсы фанетыкі і графікі. Экспрэсіўны патэнцыял словаўтварэння. Экспрэсіўныя сродкі лексікі і фразеалогіі. Экспрэсіўныя рэсурсы марфалогіі. Сінтаксічныя канструкцыі як прыём экспрэсівізацыі тэксту. Выяўленчыя магчымасці пунктуацыі.

**7. Структурна-семантычныя адзінкі тэксту.** Формы маўлення: маналагічная і дыялагічная. Складанае сінтаксічнае цэлае як адзінка маналагічнага маўлення. Структура складанага сінтаксічнага цэлага. Складанае сінтаксічнае цэлае і абзац. Сказ-выказванне як мінімальная адзінка маналагічнага тэксту.

Дыялагічнае адзінства як адзінка дыялагічнага маўлення. Асноўныя тыпы дыялагічных адзінстваў. Рэпліка як мінімальная адзінка дыялагічнага тэксту. Віды рэплік: рэплікі-стымулы і рэплікі-рэакцыі. Асаблівасці рэплік-рэакцый.

Моцныя пазіцыі тэксту: загаловак, эпіграф, пачатак, канцоўка.

**8. Тыпалогія тэкстаў.** Тэматычныя класіфікацыі тэкстаў. Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя М. Дзьюі.

Класіфікацыя паводле структурных асноў тэксту Э. Верліха: дэскрыптыўныя, наратыўныя, тлумачальныя, аргументыўныя, інструктыўныя тэксты.

Класіфікацыя тэкстаў паводле ступені мадэлявання: цвёрдыя, узуальныя, свабодныя.

Класіфікацыя тэкстаў паводле формы ўяўлення: вусныя, пісьмовыя.

Тыпалогія тэкстаў паводле характару адлюстравання рэчаіснасці: мастацкія (празаічныя і вершаваныя) і немастацкія тэксты. Класічная і арнаментальная проза.

Класіфікацыя тэкстаў паводле характару прэзентацыі інфармацыі: вербальныя тэксты, іканічныя, крэалізаваныя. Тэксты з частковай і поўнай крэалізацыяй.

Тыпалогія тэкстаў паводле характару маўлення: “Я распавядаю” (ад 1-й асобы), “Ты распавядаеш” (ад 2-й асобы), “Ён распавядае” (ад 3-й асобы);

Тыпалогія тэкстаў паводле характару перадачы чужога маўлення: простая, ускосная, няўласна-простая мова.

Тыпалогія тэкстаў паводле колькасці ўдзельнікаў маўлення: маналог, дыялог, палілог. Маўленчыя тыпы маналогу. Тыпы і функцыі дыялогу ў мастацкай літаратуры. Асаблівасці сцэнічнага дыялогу.

Тыпы тэкстаў паводле функцыянальна-сэнсавага прызначэння: апісанне, яго структура і разнавіднасці; апавяданне, яго структура і разнавіднасці; разважанне, яго структура і разнавіднасці. Роля рэмы ў арганізацыі і тыпалогіі тэксту.

Функцыянальна-стылістычная тыпалогія тэкстаў: афіцыйна-справавыя, навуковыя, публіцыстычныя, мастацкія, гутаркова-штодзённыя. Рэлігійныя, рэкламныя і гендарныя тэксты. Спецыфіка Інтэрнэт-камунікацыі. Жанравая разнастайнасць тэкстаў.

**9. Успрыманне і дэкадзіраванне тэксту.** Катэгорыя глабальнага вертыкальнага кантэксту.

Паняцце прэсупазіцыі як інфармацыйнага фонду, адзінага для аўтара і інтэрпрэтатара тэксту. Роля фонавых ведаў у працэсе ўспрымання тэксту. Класіфікацыі фонавых ведаў паводле ступені распаўсюджанасці.

Унутрытэкставы вертыкальны кантэкст. Інтэртэкстуальнасць як катэгарыяльная характарыстыка тэксту. Шырокае і вузкае разуменне інтэртэкстуальнасці. Разнастайнасць форм міжтэкставага ўзаемадзеяння ў залежнасці ад функцыянальна-стылістычнай прыналежнасці тэкстаў. Прэцэдэнтныя тэксты як матэрыяльныя знакі інтэртэкстуальнасці. Цытаты, алюзіі, тэкставыя рэмінісцэнцыі як праявы інтэртэкстуальнасці.

Паняцце моўнай асобы. Вызначэнне структуры моцнай моўнай асобы. “Выпрабаванне інтэртэкстам” як крытэрый моцнай моўнай асобы.

**10. Тэкст як лінгвадыдактычная адзінка.** Тэкст у сістэме навучання беларускай мове. Паняцце навучальнага тэксту. Тэкст на занятках па развіцці звязнага маўлення. Выкарыстанне тэксту ў працэсе фарміравання арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў. Выкарыстанне тэксту ў працэсе вывучэння лексікі і граматыкі. Вывучэнне моўных паняццяў на тэкставай аснове. Тэкстаўтваральныя функцыі моўных адзінак.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

### ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
### «ТЭКСТАЛІНГВІСТЫКА»
### для спецыяльнасці 1–21 81 04 «Тэксталогія» (дзённая форма навучання)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя Заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Тэксталінгвістыка** | **28** | **20** | | | | | |
| 1. | Тэксталінгвістыка як вучэбная дысцыпліна. | 2 | 2 | | | | | Вуснае апытванне |
| 2. | Тэкст у сістэме моўных адзінак і моўных узроўняў. | 2 | 2 | | | | | |
| 3. | Інтэграцыйныя параметры тэксту. | 2 | 2 | | | | | |
| 4. | Семантычная арганізацыя тэксту. | 4 | 2 | | | | | |
| 5. | Віды інфармацыі ў тэксце. | 2 | 2 | | | | | Пісьмовы тэст |
| 6. | Катэгорыі тэксту. | 4 | 2 | | | | | |
| 7. | Структурна-семантычныя адзінкі тэксту. | 2 | 2 | | | | | |
| 8. | Тыпалогія тэкстаў. | 2 | 2 | | | | | Вуснае паведамленне |
| 9. | Успрыманне і дэкадзіраванне тэксту. | 4 | 2 | | | | | Рэферат |
| 10. | Тэкст як лінгвадыдактычная адзінка**.** | 2 | 2 | | | | | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Асноўная літаратура


1. Абабурка, М. В. Асновы лінгвістыкі літаратурна-мастацкага тэксту / М. В. Абабурка. – Магілёў, 1997.
2. Абабурка, М.В. Практычныя асновы беларускай лінгвістычнай паэтыкі і тэксталогіі / М.В. Абабурка. – Магілёў, 2003.
3. Абабурка, М.В. Тэарэтычныя асновы беларускай лінгвістычнай тэксталогіі / М.В. Абабурка. – Магілёў, 2003.
4. Зборнік тэкстаў для лінгвістычнага аналізу / аўт.-склад.: З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск, 2005.
5. Лепешаў, І. Я. Лінгвістычны аналіз літаратурнага твора / І. Я. Лепешаў. – Мінск, 1981.
6. Лепешаў, І. Я. Лінгвістычны аналіз літаратурнага твора. Частка 2 / І. Я. Лепешаў. – Гродна, 2000.
7. Лепешаў, І.Я. Лінгвістычны аналіз тэксту: вучэб. дапам. / І.Я. Лепешаў. – Мінск, 2009.
8. Малажай, Г. М. Лінгвістычны аналіз тэксту / Г. М. Малажай. – Мінск., 1992.
9. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка тэксту / М. Я. Цікоцкі. – Мінск, 2002.
10. Юрэвіч, А.К. Лінгвістычны аналіз мастацкага тэксту / А.К. Юрэвіч. – Мінск, 1978.


### Дадатковая літаратура


1. Анисимова, Е. Е. Лингвистика текста и межкультурная коммуникация (на материале креолизованных текстов) / Е. Е. Анисимова. – Москва, 2003.
2. Арнольд, И.В. Семантика. Стилистика. Интертекстуальность / И.В. Арнольд. – СПб., 1999.
3. Бабенко, Л. Г., Казарин, Ю. В. Лингвистический анализ художественного текста. Теория и практика / Л. Г. Бабенко, Ю. В. Казарин. – Москва, 2004.
4. Болотнова, Н.С. Филологический анализ текста / Н.С.Болотнова. – Москва, 2007.
5. Борисова, Л. В. Интерпретация текста (проза) / Л. В. Борисова. – Минск., 1999.
6. Валгина, Н. С. Теория текста / Н. С. Валгина. – Москва, 2003.
7. Десюкевич, О.И. Теория текста / О.И. Десюкевич. – Минск, 2011.

8. Интерпретация художественного текста в вузе и школе. – Санкт-Петербург,1993.
9. Кочан, І. Лінгвістичний аналіз тексту: Курс лекцій / І. Кочан. – Львів, 1999.
10. Кухаренко, В. А. Интерпретация текста / В.А. Кухаренко. – Москва, 1988.
11. Лінгвістычны аналіз тэксту / пад рэд. Ф. Янкоўскага. – Мінск, 1978.
12. Лукин, В.А. Художественный текст: Основы лингвистической теории. Аналитический минимум / В.А. Лукин. – Москва, 2009.
13. Маслова, В. А. Комплексный анализ художественного текста / В. А. Маслова. – М., 2003.
14. Маслова, В. А. Лингвистический анализ экспрессивности художественного текста / В. А. Маслова. – Минск., 1997.
15. Маслова, В. А. Филологический анализ поэтического текста / В. А. Маслова. – Мн., 1999.
16. Маслова, В. А. Филологический анализ художественного текста / В. А. Маслова. – Мн., 2000.
17. Пісарук, Г. В., Верамеюк, Г. А. Лінгвістыка тэксту: Практычны матэрыял для студэнтаў філалагічных факультэтаў / Г. В. Пісарук, Г. А. Верамеюк. – Брэст, 1994.
18. Писорук, Г. В. Лингвистический нализ текста на уроках русского языка / Г. В. Писорук. – Брест, 1998.
19. Ревуцкий, О. И. Филологический анализ художественного текста / О. И. Ревуцкий. – Минск, 2006.
20. Старасценка, Т. Я. Стылістыка тэксту: дапаможнік / Т. Я. Старасценка. – Мінск: БДПУ, 2007. – 58 с.
21. Супрун, А. Е. Исследования по лингвистике текста / А. Е. Супрун. – Минск, 2001.
22. Тураева, З.Я. Лингвистика текста. Текст: Структура и семантика. – Москва, 2009.
23. Чумак, Л. Н. Синтаксис русского и белорусского языков в аспекте культурологии / Л.Н. Чумак. – Минск, 1997.
24. Шабес, В. Я. Событие и текст / В. Я. Шабес. – Москва, 1989.
25. Шанский, Н. М. Лингвистический анализ стихотворного текста / Н. М. Шанский. – Москва, 2002.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для кантролю якасці адукацыі па вучэбнай дысцыпліне “Тэксталінгвістыка” выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

- тэсты па вывучаемых раздзелах (тэмах);
- вуснае (пісьмовае) апытванне падчас заняткаў;
- пісьмовыя кантрольныя работы;
- камп’ютарныя тэсты;
- пісьмовыя работы (эсэ, рэцэнзіі, анатацыі);
- адзнака па практычных занятках;
- выніковае тэсціраванне.

Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі раскрываюць асноўныя крытэрыі ацэнкі дзейнасці магістрантаў і суадносяцца з формамі кантролю ведаў, зафіксаванымі ў вучэбна-метадычнай карце.

Адзнака за адказы на лекцыях (апытванне) і практычных занятках можа складацца з паўнаты адказу, наяўнасці аргументаў і прыкладаў з практыкі.

Пры ацэнцы навуковага даклада звяртаецца ўвага на: змест і паўнату раскрыцця тэмы, структуру і паслядоўнасць выкладу, крыніцы і іх інтэрпрэтацыю, карэктнасць афармлення.

Ацэнка эсэ (пераказу) можа фарміравацца на аснове наступных крытэрыяў: арыгінальнасць (навізна) пастаноўкі праблемы і спосабу яе інтэрпрэтацыі / вырашэння, самастойнасць і аргументаванасць меркаванняў, пісьменнасць і стыль выкладу.

Пры ацэнцы партфоліа прац студэнта неабходна ўлічваць: абгрунтаванасць і лагічнасць зместу, паказчыкі якасці работы студэнта (водгукі, рэцэнзіі), сістэматычнасць працы з партфоліа, наяўнасць самаацэнкі студэнтам уласных прац (рэфлексіўныя заўвагі, рэплікі, каментарыі, праекты).

Пры ацэнцы адкрытага (эўрыстычнага) задання неабходна ўлічваць: самабытнасць (арыгінальнасць) створанага адукацыйнага прадукта, даследаванне вывучанага феномену з розных бакоў, інтэграванне ведаў з розных галін дзейнасці, асобасная значнасць дасягнутых вынікаў.

Ацэнка праекта можа ўключаць актуальнасць праблемы, карэктнасць выкарыстаных метадаў даследавання, прыцягненне ведаў з розных галін навукі, арганізацыя калектыўнай дзейнасці, практыкаарыентаванасць атрыманых вынікаў.

Форма бягучай атэстацыі –экзамен.

## МЕТОДЫКА ФАРМІРАВАННЯ ВЫНІКОВАЙ АДЗНАКІ

Пры фарміраванні выніковай адзнакі выкарыстоўваецца рэйтынгавая ацэнка ведаў магістрантта, якая дае магчымасць прасачыць і ацаніць дынаміку працэсу дасягнення мэты навучання. Рэйтынгавая ацэнка прадугледжвае выкарыстанне вагавых каэфіцыентаў для бягучага кантролю ведаў і бягучай атэстацыі магістрантаў па дысцыпліне.

Прыкладныя каэфіцыенты, якія вызначаюць унёсак бягучага кантролю ведаў і бягучай атэстацыі ў рэйтынгавую ацэнку:

Фарміраванне ацэнкі за бягучую паспяховасць:

адказы на практычных занятках - 25 %;

падрыхтоўка навуковага артыкула - 25 %;

падрыхтоўка рэферата - 25 %;

выкананне тэста - 25 %.

Рэйтынгавая ацэнка па дысцыпліне разлічваецца на аснове ацэнкі бягучай паспяховасці і экзаменацыйнай адзнакі з улікам іх вагавых каэфіцыентаў. Ацэнка бягучай паспяховасці складае 50 %, экзаменацыйная ацэнка - 50 %.

Выніковая адзнака фарміруецца на аснове 3-ох дакументаў:

1. Правила проведения аттестации (Постановление Министерства образования № 53 от 29 мая 2012 г.).
2. Положение о рейтинговой системе БГУ (ред. 2015 г.)
3. Критерии оценки студентов (10 баллов).

# ТЭМАТЫКА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

**Тэксталінгвістыка як вучэбная дысцыпліна.**

1. Прадмет і задачы тэксталінгвістыкі.
2. Міждысцыплінарны характар тэксталінгвістыкі.

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2

**Тэкст у сістэме моўных адзінак і моўных узроўняў.**

1. Тэкст як кампанент маўленчай і мысленчай дзейнасці. Кампаненты тэкставай дзейнасці.
2. Агульнасеміятычнае і лінгвістычнае разуменне тэксту. Праблема дэфініцыі тэксту. Суадносіны паняццяў *тэкст* і *дыскурс*.
3. Асноўныя падыходы да вывучэння тэксту. Напрамкі даследавання тэксту ў беларускім мовазнаўстве: стылістычны; семіятычны; рытарычны.

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 3

**Інтэграцыйныя параметры тэксту.**

1. Тэматычнае адзінства, адзінства знешняй і ўнутранай формы тэксту. Разгорнутасць тэксту.
2. Звязнасць тэксту. Спосабы сэнсавай сувязі сказаў у тэксце.
3. Цэласнасць тэксту. Камунікатыўнае, сэнсавае і тэматычнае адзінства як перадумовы стварэння цэласнасці тэксту. Роля ключавых слоў у забеспячэнні цэласнасці тэксту.
4. Закончанасць як інтэграцыйны параметр тэксту, які ўзнікае на аснове разгорнутасці, паслядоўнасці, звязнасці.

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 4

**Семантычная арганізацыя тэксту.**

1. Канцэптуальная прастора тэксту.
2. Дэнататыўная прастора тэксту.
3. Эматыўная прастора тэксту.
4. Камунікатыўна-сінтаксічная арганізацыя тэксту. Знакавая прырода тэкставых катэгорый.

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 5

**Віды інфармацыі ў тэксце.**

1. Змястава-фактуальная інфармацыя, змястава-канцэптуальная інфармацыя, змястава-падтэкставая інфармацыя. Падтэкст і “прырашчэнне” сэнсу ў тэксце.
2. Аб’ёмна-прагматычнае і кантэкстава-варыятыўнае чляненне тэксту. Асаблівасці члянення мастацкіх (празаічных, драматычных, паэтычных), навуковых, афіцыйна-справавых, публіцыстычных тэкстаў.

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 6

**Катэгорыі тэксту.**

1. Кагезія і кантынуум як тэкставыя катэгорыі. Сродкі і формы кагезіі.
2. Аўтасемантыя як тэкставая катэгорыя. Аўтарскія адступленні, сентэнцыі, афарызмы, цытаты як формы рэалізацыі аўтасемантыі.
3. Рэтраспекцыя і праспекцыя як формы дыскантынууму.
4. Мадальнасць тэксту.
5. Факультатыўныя (другасныя) катэгорыі тэксту.

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 7

**Структурна-семантычныя адзінкі тэксту.**

1. Формы маўлення. Складанае сінтаксічнае цэлае як адзінка маналагічнага маўлення.
2. Дыялагічнае адзінства як адзінка дыялагічнага маўлення. Асноўныя тыпы дыялагічных адзінстваў.
3. Моцныя пазіцыі тэксту: загаловак, эпіграф, пачатак, канцоўка.

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 8

**Тыпалогія тэкстаў.**

1. Тэматычныя класіфікацыі тэкстаў. Тыпы тэкстаў паводле функцыянальна-сэнсавага прызначэння.
2. Класіфікацыя паводле структурных асноў тэксту. Функцыянальна-стылістычная тыпалогія тэкстаў.
3. Класіфікацыя тэкстаў паводле ступені мадэлявання і паводле формы ўяўлення.
4. Тыпалогія тэкстаў паводле характару адлюстравання рэчаіснасці і паводле характару прэзентацыі інфармацыі.
5. Тыпалогія тэкстаў паводле колькасці ўдзельнікаў маўлення, паводле характару маўлення і характару перадачы чужога маўлення.

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 9

**Успрыманне і дэкадзіраванне тэксту.**

1. Катэгорыя глабальнага вертыкальнага кантэксту.
2. Паняцце прэсупазіцыі як інфармацыйнага фонду, адзінага для аўтара і інтэрпрэтатара тэксту. Роля фонавых ведаў у працэсе ўспрымання тэксту. Класіфікацыі фонавых ведаў паводле ступені распаўсюджанасці.
3. Унутрытэкставы вертыкальны кантэкст. Інтэртэкстуальнасць як катэгарыяльная характарыстыка тэксту.
4. Паняцце моўнай асобы. Вызначэнне структуры моцнай моўнай асобы. “Выпрабаванне інтэртэкстам” як крытэрый моцнай моўнай асобы.

ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 10

**Тэкст як лінгвадыдактычная адзінка.**

1. Тэкст у сістэме навучання беларускай мове. Паняцце навучальнага тэксту.
2. Тэкст на занятках па развіцці звязнага маўлення. Выкарыстанне тэксту ў працэсе фарміравання арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў.
3. Выкарыстанне тэксту ў працэсе вывучэння лексікі і граматыкі.

ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ЎСТАНОВЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца узгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| 1. Методология лингвистических исследований | Тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства | няма | Зацвердзіць Пратакол № 8 ад 12.05.2018 г. |
| | | | |

ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ЎСТАНОВЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
на 2019 / 2020 вучэбны год

| №№ пп | Дапаўненні і змены | Падстава |
| --- | --- | --- |
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры
(пратакол № ____ ад ___________ 201_ г.)

Загадчык кафедры

__________________ ________________ __________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта
__д.ф.н., прафесар__ ________________ __І.С. Роўда_______
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча

## Апісанне інавацыйных падыходаў і метадаў да выкладання вучэбнай дысцыпліны

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца ***эўрыстычны падыход***, які прадугледжвае:

- ажыццяўленне магістрантамі асобасна-значных адкрыццяў навакольнага свету;
- дэманстрацыю разнастайнасці вырашэнняў большасці прафесійных задач і жыццёвых праблем;
- творчую самарэалізацыю магістрантаў у працэсе стварэння адукацыйных прадуктаў;
- індывідуалізацыю навучання праз магчымасць самастойна ставіць мэты, ажыццяўляць рэфлексію ўласнай адукацыйнай дзейнасці.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца ***практыка-арыентаваны падыход***, які прадугледжвае:

- засваенне зместу адукацыі праз вырашэнне практычных задач;
- набыццё навыкаў эфектыўнага выканання розных відааў прафесійнай дзейнасці;
- арыентацыю на генераванне ідэй, рэалізацыю групавых праектаў, развіццё прадпрымальніцкай культуры.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца ***метад аналізу канкрэтных сітуацый (кейс-метад)***, які прадугледжвае:

- набыццё ведаў і ўменняў для вырашэння практычных задач;
- аналіз сітуацыі з выкарыстаннем прафесійных ведаў, уласнага вопыту, дадатковай літаратуры і іншых крыніц.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца **метад праектнага навучання**, які прадугледжвае:

- спосаб арганізацыі вучэбнай дзейнасці, які развівае актуальныя для вучэбнай і прафесійнай дзейнасці навыкі планавання, самаарганізацыі, супрацоўніцтва і прадугледжвае стварэнне ўласнага прадукта;
- набыццё навыкаў для вырашэння даследчых, творчых, сацыяльных, прадпрымальніцкіх і камунікатыўных задач.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца ***метад партфоліа***, які з'яўляецца эфектыўным сродкам рэалізацыі індывідуальнай адукацыйнай праграмы магістрантаў. Усе вынікі і дасягненні групуюцца на аснове асноўных відаў дзейнасці магістрантаў: вучэбнай, навукова-даследчай і інш.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца ***метад вучэбнай дыскусіі***, які прадугледжвае ўдзел магістрантаў у мэтанакіраваным абмене думкамі, ідэямі для прад'яўлення і ўзгаднення наяўных пазіцый па адпаведнай праблеме.

Выкарыстанне метаду забяспечвае з'яўленне новага ўзроўню разумення вучэбнай тэмы, ужыванне ведаў (тэорый, канцэпцый) пры вырашэнні праблем.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваюцца **метады і прыёмы развіцця крытычнага мыслення**, якія з'яўляюцца сістэмай, што фарміруе навыкі працы з інфармацыяй у працэсе чытання і канспектавання; разуменне інфармацыі як пачатковага, а не канчатковага пункта крытычнага мыслення.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца **метад групавога навучання**, які з'уляецца формай арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці магістрантаў, што прадугледжвае функцыянаванне розных тыпаў міні-груп, якія працуюць як над агульнымі, так і спецыфічнымі вучэбнымі заданнямі.

## Метадычныя рэкамендацыі
## па арганізацыі самастойнай работы магістрантаў

Змест і формы самастойнай работы магістрантаў распрацоўваюцца, выбіраюцца і адаптуюцца ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі падрыхтоўкі спецыялістаў.

Найбольш эфектыўнымі формамі і метадамі арганізацыі самастойнай работы магістрантаў з'яўляюцца:

- выкананне прамежкавых тэстаў;
- распрацоўка індывідуальных і калектыўных навукова-творчых заданняў і праектаў;
- падрыхтоўка і ўдзел у правядзенні актыўных форм навучання (дыскусіі, дэбаты, прэс-канферэнцыі);
- лінгвастылістычны аналіз тэкстаў розных стыляў;
- вывучэнне магістрантамі навукова-метадычных артыкулаў па праблемах беларускага і замежнага мовазнаўства, іх анатаванне і рэцэнзаванне;
- падрыхтоўка навуковых матэрыялаў, дакладаў, навукова-даследчых работ для ўдзелу ў навукова-практычных канферэнцыях, конкурсах;
- самакантроль шляхам выканання трэніровачных (у тым ліку камп'ютарных) тэстаў і заданняў;
- індывідуальныя кансультацыі з выкладчыкам.

Для арганізацыі самастойнай работы магістрантаў па вучэбнай дысцыпліне выкарыстоўваюцца сучасныя інфармацыйныя рэсурсы, змешчаныя на адукацыйным партале: комплекс вучэбных і вучэбна-метадычных матэрыялаў (вучэбна-праграмныя матэрыялы, вучэбныя выданні для тэарэтычнага вывучэння дысцыпліны, зборнік практыкаванняў, метадычныя ўказанні да практычных заняткаў, матэрыялы бягучага кантролю і бягучай атэстацыі, якія дазваляюць вызначыць адпаведнасць вучэбнай дзейнасці магістрантаў патрабаванням адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі і вучэбна-праграмнай дакументацыі, у т.л. пытанні для падрыхтоўкі да заліку, заданні, тэсты, пытанні для самакантролю, спіс рэкамендуемай літаратуры, інфармацыйных рэсурсаў і інш.).

## ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

1. Тэксталінгвістыка – гэта дысцыпліна, якая вывучае:
а) правілы пабудовы звязнага тэксту і яго сэнсавыя катэгорыі, што выражаюцца па гэтых правілах;
б) камунікацыйныя якасці маўлення;
в) заканамернасці спалучэння слоў у словазлучэнні і сказы, будову сказаў, а таксама іх тыпы;
г) стылістычную праўку тэксту.

2. Тэкст – гэта:
а) твор мастацкай літаратуры;
б) паслядоўнасць моўных знакаў, асноўнымі ўласцівасцямі якой з'яўляюцца звязнасць і цэласнасць;
в) функцыянальна-сэнсавы тып маўлення;
г) пералік звязаных па сэнсу словаў.

3. Тэкст у адрозненне ад дыскурсу:
а) структура, якая мае свае ўнутраныя – унутрытэкставыя заканамернасці, што звязваюць паслядоўнасць выказванняў у адзіную тэкставую сістэму;
б) маўленне ў сукупнасці з экстралінгвістычнымі, прагматычнымі, сацыякультурнымі, псіхалагічнымі і інш. фактарамі.

4. Лінгвацэнтрычны падыход да вывучэння тэксту прадугледжвае:
а) суаднесенасць мова – тэкст, вывучэнне функцыянавання моўных адзінак і катэгорый ва ўмовах мастацкага тэксту;
б) тэкст як аўтаномнае структурна-сэнсавае цэлае па-за суаднесенсцю з удзельнікамі літаратурнай камунікацыі, уяўленне аб тэксце як выніку і прадукце творчай дзейнасці;
в) суаднесенасць аўтар – тэкст – чытач, інтэрпрэтацыю тэксту ў аспекце яго стварэння (пазіцыя аўтара) і ўспрыняцця (пазіцыя чытача), у аспекце ўздзеяння на чытача і ў дэрывацыйным аспекце;
г) суаднесенасць аўтар – тэкст – па-за тэкставая рэчаіснасць.

5. Асноўнымі прыметамі тэксту з'яўляюцца:
а) цэласнасць;
б) звязнасць;
в) завершанасць;
г) мадальнасць.

6. Глыбінная структура тэксту ў адрозненне ад паверхневай:
а) ідэйна-тэматычны змест, складанае перапляценне адносінаў і характараў; аўтарскія інтэнцыі, прагматычная ўстаноўка;

б) лінгвістычная форма тэксту.

7. Прыметамі тэмы тэксту з’яўляюцца:
а) прадмет абмеркавання ў тэксце,
б) намінатыўна выражанае зместавае ядро цэлага тэксту, якое супастаўляецца з аўтарскім намерам;
в) асноўная думка ў тэксце;
г) інфармацыя аб свеце, якая афарбаваная індывідуальна-аўтарскай ацэначнасцю і эмацыйнасцю.

8. Асноўныя элементы кампазіцыі тэксту:
а) завязка;
б) развіццё дзеяння;
в) развязка;
г) вывад.

9. Катэгорыі тэксту – гэта:
а) набор характарыстык, якія адрозніваюць тэкст ад не-тэксту;
б) функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўлення;

10. Звязнасць тэксту
а) абумоўлена лінейнасцю кампанентаў тэксту і рэалізуецца праз знешняе спалучэнне літар, гукаў, сказаў;
б) забяспечваецца адзінствам прадмета гаворкі;
в) максімальная падпарадкаванасць усіх элементаў зместу і формы асноўнай ідэі аўтара;
г) забяспечваецца лінейнасцю кампанентаў тэксту.

11. Экспліцытная сэнсавая сувязь:
а) арганізавана пры дапамозе словаў (лексічная), граматычных формаў, пэўных структур сказа;
б) схаваная, нявыражаная ў тэксце.

12. Лакальная звязнасць
а) праяўляецца ў межах абзаца;
б) праяўляецца ў межах тэксту.

13. Зместава-фактуальная інфармацыя
а) фарміруецца на падставе прамых выказванняў аўтара;
б) перадае суб’ектыўныя аўтарскія развaжанні адносна праблемы;
в) змяшчае дадатковыя сігналы аўтарскага бачання праблемы;
г) выражае станоўчую аўтарскую пазіцыю.

14. Мажорная танальнасць тэксту:
а) адлюстраванне адмоўных эмацыйных прымет;

б) адлюстраванне станоўчых ацэнак;
в) забяспечваецца аб'ектыўнасцю выкладу;
г) забяспечваецца суб'ектыўнасцю выкладу.

15. Аб'ектыўны час у тэксце
а) адлюстроўвае разнавіднасці рэальнага часу: гістарычны, каляндарны;
б) прыметы рэальнасці не маюць значэння, вылучаецца статычнасцю і праўляецца ў навуковых канцэпцыях;
в) звязаны з індывідуальным асэнсаваннем мадэлі часу;
г) перадае аўтарскае бачанне пытання.

16. Тэкставая катэгорыя 'хранатоп' прадугледжвае спалучэнне наступных катэгорый:
а) лакальнасць;
б) тэмпаральнасць;
в) рэтраспекцыя;
г) завершанасць.

17. Класіфікацыя тэкстаў Дзьюі – гэта:
а) тэматычная класіфікацыя тэкстаў;
б) бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя;
в) лінгвістычная класіфікацыя;
г) аналіз структуры тэксту.

18. Лінгвістычная класіфікацыя тэкстаў праводзіцца па наступных параметрах:
а) па характары пабудовы чужога маўлення;
б) па ўдзелу ў маўленні аднаго, двух або больш камунікантаў;
в) па функцыянальна-сэнсаваму прызначэнню;
г) па ўзроўнях мовы.

19. Алітэрацыя – гэта
а) паўтор галосных гукаў;
б) паўтор зычных гукаў;
в) сінонімы;
г) антонімы.

20. Мужчынскай называецца рыфма з націскам:
а) на апошнім складзе ў радку;
б) на перадапошнім складзе ў радку;
в) на трэцім ад канца складзе радка;
г) на першым складзе ў радку.

21. Моцнымі пазіцыямі тэксту з'яўляюцца:
а) загаловак;

б) пачатак тэксту;
в) кульмінацыя;
г) канец тэксту.

22. Асноўнымі сродкамі міжфразавай сувязі з'яўляюцца:
а) лексічныя;
б) лексіка-граматычныя;
в) сінтаксічныя;
г) акцэнталагічныя.

23. Тыпамі міжфразавай сувязі лічаць:
а) ланцужковую;
б) паралельную;
в) паўторную;
г) змешаную.

24. Відамі рэматычнай дамінанты лічаць:
а) прадметную;
б) якасную;
в) прыслоўную;
г) статальную.

25. Асноўныя функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўлення:
а) апісанне;
б) апавяданне;
в) далучэнне;
г) разважанне.

**ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «ТЭКСТАЛІНГВІСТЫКА»**

1. Тэксталінгвістыка як вучэбная дысцыпліна. Прадмет і задачы тэксталінгвістыкі.
2. Тэкст як кампанент маўленчай і мысленчай дзейнасці. Кампаненты тэкставай дзейнасці.
3. Тэкст у сістэме моўных адзінак і моўных узроўняў.
4. Шматаспектнасць вывучэння тэксту: граматыка тэксту, семантыка тэксту, стылістыка тэксту, прагматыка тэксту.
5. Асноўныя падыходы да вывучэння тэксту: лінгвацэнтрычны, тэкстацэнтрычны, антрапацэнтрычны, кагнітыўны, функцыянальны, прагматычны, рытарычны і інш.
6. Напрамкі даследавання тэксту ў беларускім мовазнаўстве: стылістычны; семіятычны; рытарычны.
7. Інтэграцыйныя параметры тэксту.
8. Тэматычнае адзінства, адзінства знешняй і ўнутранай формы тэксту.
9. Разгорнутасць тэксту. Тэма як згорнуты змест тэксту.
10. Паслядоўнасць як схема, якая адлюстроўвае парадак элементаў зместу. Кампазіцыя тэксту.
11. Звязнасць тэксту. Спосабы сэнсавай сувязі сказаў у тэксце.
12. Цэласнасць тэксту.
13. Закончанасць як інтэграцыйны параметр тэксту, які ўзнікае на аснове разгорнутасці, паслядоўнасці, звязнасці.
14. Семантычная, канцэптуальная, дэнататыўная, эматыўная прастора тэксту.
15. Камунікатыўна-сінтаксічная арганізацыя тэксту. Паняцце гіпертэмы і гіперрэмы.
16. Катэгорыі тэксту. Знакавая прырода тэкставых катэгорый.
17. Кагезія як від унутрытэкставых сувязей. Сродкі і формы кагезіі.
18. Кантынуум як тэкставая катэгорыя.
19. Аўтасемантыя як тэкставая катэгорыя.
20. Рэтраспекцыя і праспекцыя як тэкставыя катэгорыі.
21. Мадальнасць тэксту.
22. Факультатыўныя катэгорыі тэксту.
23. Катэгорыя экспрэсіўнасці тэксту.
24. Формы маўлення: маналагічная і дыялагічная.
25. Складанае сінтаксічнае цэлае як адзінка маналагічнага маўлення.
26. Дыялагічнае адзінства як адзінка дыялагічнага маўлення.
27. Моцныя пазіцыі тэксту: загаловак, эпіграф, пачатак, канцоўка.
28. Тыпалогія тэкстаў.
29. Катэгорыя глабальнага вертыкальнага кантэксту. Прэсупазіцыя.
30. Тэкст у сістэме навучання беларускай мове.